# ПАРТРЭТНАЯ ДЭТАЛЬ У АПАВЯДАННЯХ ЗБОРНІКА “НЯЗРУШАНЫ КАМЕНЬ” ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА

**Рубель А. В.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дац. *Тарасава С. М.*

У празаічных творах важнае значэнне маюць не толькі шырокія апісанні падзей, паводзін герояў, але і шматлікія “падрабязнасці”, дробныя штрыхі ў характарыстыцы персанажаў, заўвагі, жэсты, рэплікі. Выразныя і разам з тым вельмі змястоўныя штрыхі называюць мастацкімі дэталямі.

Партрэтная дэталь з’яўляецца разнавіднасцю мастацкай дэталі. Мастацкая дэталь, паводле азначэння, пададзенага ў літаратуразнаўчым слоўніку В. Рагойшы, – гэта такая падрабязнасць літаратурнага твора, якая з асаблівай сілай абуджае ўяўленне і творчую думку чытача, нясе значную ідэйна-эмацыянальную і сэнсавую нагрузку [1, с. 64].

Партрэтныя дэталі ўяўляюць сабой апісанне знешнасці чалавека, уключаючы твар, целасклад, адзенне, жэстыкуляцыю, міміку і манеру паводзін. Па адной такой дэталі можна меркаваць аб характары героя, яго схільнасцях, псіхалогіі, маральных якасцях. Вывучэнню партрэтнай дэталі, яе ролі ў творы прысвечаны даследаванні А. Пяткевіча, П. Пялевінай, А. Гатаўлінай, В. Шынкевіч і інш.

Творчасць Вячаслава Адамчыка, пісьменніка з ярка выяўленай сацыяльна-псіхалагічнай адзнакай прозы, з’яўляецца прыдатным матэрыялам для даследавання праблемы партрэтнай дэталі як важнага сродку раскрыцця мастацкага вобразу. Намі ўстаноўлена, што ў апошнім зборніку В. Адамчыка “Нязрушаны камень”, які пранізаны шчымлівым трагедыйна-драматычным пафасам, менавіта праз партрэтную дэталь аўтар перадае супярэчлівую кантраснасць падзей і асобаў, што праявілі сябе ў няпростых гістарычна-сацыяльных абставінах сярэдзіны ХХ стагоддзя.

Апавяданні “Ноч на Галавасека” і “Прылёт кажана” – гэта ілюстрацыя жахлівых падзей перыяду Вялікай Айчыннай вайны, калі выяўляліся як высокія, так і самыя ганебныя праявы чалавечых паводзін. У творах В. Адамчыка апісанне знешнасці цесна спалучаецца з псіхалагічным аналізам персанажаў. У партрэтных апісаннях увага аўтара сканцэнтравана на тым, што выяўляюць фігуры ці твары людзей, якое ўражанне яны пакідаюць, якія пачуцці і думкі выклікаюць.

Так у апавяданні “Ноч на Галавасека” ў ходзе разгортвання падзей аўтар падае партрэтныя дэталі азлобленага Сцяпана Галаскока і безабаронных аднавяскоўцаў. Элементы знешнасці героя выяўляюць яго як асобу з выключна зласлівымі і помслівымі намерамі: *“Рослы, трохі суталаваты Сцёпа Галаскок раздзьмуў крылы пляскатага носа”* [2, с. 75], *“зласліва і з’едліва ўхмыльнуўся”*, *“сягаючы размашыста і хутка, <...> пусціўся ў пагон”* [2, с. 84]. *“У дужай і ўчэпістай Галаскокавай руцэ”* [2, с. 85] і інш.



Рэпазіторый ГрГМУ

Засяроджваючы ўвагу чытачоў на дэталях знешнасці вяскоўцаў, тых, хто стаў ахвярай бяздумнай расправы, аўтар яскрава падкрэслівае іх безабароннасць і бездапаможнасць: *“бездапаможна заенчыў Старук”*, *“дрыготкія рукі Старука зашкрабліся па грудзях, намагаючыся хапіцца за пятлю”* [2, с. 87]. Ад рук помслівага Галаскока гінуць непавінныя *“схуднелая, доўгатварая Косця, жонка Юзафа Старука”* [2, с. 101] і *“праставалосая ў светлай сукенцы”* [2, с. 100] Сарафіна. Ён забівае настаўніцу, *“сівавалосую насатую Цыгельскую”* [2, с. 101], і яе сына, *“маладога, гадоў шаснаццаці хлопца”* [2, с. 102]. Простыя дэталі знешняга аблічча аднавяскоўцаў рэзка кантрастуюць са знешнасцю і паводзінамі забойцы.

У апавяданні “Прылёт кажана”, дзе таксама ўзнаўляецца адзін з трагічных эпізодаў ваеннага часу, В. Адамчык узмацняе канфліктнае напружанне, падаўшы ў параўнанні партрэтныя дэталі ў знешнасці настаўніцы Леанарды Баброўскай і яе забойцаў-здраднікаў. Апісанні гэтых герояў (дэталі целаскладу, твару, рухаў, адзення) указваюць на страту ў іх усякага пачуцця спагады і чалавечнасці: “*Іх было пяцёра, смярдзючых ад тытуню і самагоннага перагару дужых мужчын”* [2, с. 11], *“апранутыя хто як – у напалову вайсковае, у напалову цывільнае, – але ўсе падпаясаныя шырокімі рамянямі”* [2, с. 12]. “*Іхнія чырвоныя ад перапою, адутлаватыя твары”* [2, с. 14], “*прагна гараць іх асалавелыя з шкляным водбліскам вочы, як яны раз’юшана дыхаюць”* [2, с. 28].

І зусім іншыя дэталі вылучае аўтар у абліччы ўбачанай імі маладой жанчыны, указвае на “*пухкія губкі ў валавокай, прыгожай з твару»* настаўніцы, далікатна падкрэслівае, як *«накінуўшы лёгкі халацік, яна падышла да дзвярэй”.* Неаднаразова згадваецца яе падабенства з падлеткам: *“маладая, падобная да дзеўчаняці-падлетка настаўніца”* [2, с. 14], *“на яе адну, кволую, як падлетак, з вялікімі перапалоханымі вачыма маладую настаўніцу”* [2, с. 11], што яшчэ больш робіць згаданы вобраз кранальным і безабаронным.

Праз кантрасныя партрэтныя дэталі ў апавяданні аўтару ўдаецца дакладна перадаць процістаўленне злавеснага звярынага, што абудзіла ў чалавеку вайна і яе наступствы, і той адвечнай жыццёвай красы і хараства, што спрадвеку ўвасаблялася ў жаночым абліччы.

У творах Вячаслава Адамчыка нават нязначныя партрэтныя дэталі (вопратка, часткі цела, рухі і жэсты) указваюць не толькі на прыналежнасць герояў да пэўнай сацыяльнай групы, яны выяўляюць іх маральны свет, указваюць на спецыфіку часу і абставін. Згаданыя прыклады партрэтнай дэталі ў апавяданнях В. Адамчыка дапамагаюць больш завострана перадаць трагічнае процістаянне, што народжана злавесным ваенным часам, у якім адбілася адвечная непрымірымая барацьба Дабра і Зла.

Літаратура:

1. Рагойша, В. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці / В. Рагойша. – Мінск : Народная асвета, 2009. – 303 с.

2. Адамчык, В. Нязрушаны камень: апавяданні / В. Адамчык. – Мінск : Сучасны літаратар, 2002. – 320 с.



Рэпазіторый ГрДУ